В. І. Свірыдзенка

# Беларуская мова

# 4

Частка 1



В. І. Свірыдзенка

# Беларуская мова

Вучэбны дапаможнік для 4 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

У дзвюх частках

Частка 1

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2020

## ПАЎТАРЭННЕ

**Успомніце**

З чаго складаюцца словы?
Выкарыстайце схему.




**1.** Прачытайце тэкст. Калі адзначаецца Дзень ведаў? Чаму вучэнне з'яўляецца працай? Як зрабіць гэту працу раднай?




Першага верасня асабліва ўрачыста гучыць першы званок. Мы пачынаем вучыцца.

Вучэнне — праца. Яна заўсёды радасная, бо на кожным уроку мы даведваемся пра новае і цікавае.

Нездарма першы дзень заняткаў абвешчаны Днём ведаў. Гэта свята ўсёй краіны. *(Паводле В. Віткі.)*

Знайдзіце і выпішыце аднакаранёвыя словы. Выдзеліце ў іх корань.

Вызначце колькасць гукаў і літар у слове *дзень.*

**2.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

Навука *(не)*мучыць, а ж*(ы/і)*ць вуч*(ы/і)*ць.

Спішыце, раскрываючы дужкі. Знайдзіце аднакаранёвыя словы. Выдзеліце ў іх корань. Назавіце гукі, якія змяніліся ў корані слоў. Падкрэсліце адпаведныя літары.

**Успомніце**

У якім значэнні могуць ужывацца словы? Выкарыстайце схемы.

**залатая** **скачуць**



**залатая** восень




**залатая** манета



Кроплі **скачуць.**



Дзеці **скачуць.**

**3.** Прачытайце верш. Якія дзівосы адбываюцца ў прыродзе ў пачатку восені?

Назавіце дзеясловы, якія надаюць раслінам і жывёлам уласцівасці людзей. У прамым ці пераносным значэнні яны ўжыты?

## Лісток

**Звонкі** лісток адарваўся *(ад)*клёна
і *(па)*каціўся, *(па)*бег *(па)*зямлі.
А на палянцы жоўта-з*(я/е)*лёнай,
быццам на струнах, іграюць чм*(я/е)*лі.

Як я люблю вераснёвыя дзівы!
**Ходзяць** па лесе вятры-трубачы.
Толькі грыбы засядаюць маўкліва —
песням патрэбны свае слухачы.

*Э. Агняцвет.*



***засяда́юць*** — тут: *сядзяць*

Спішыце першы слупок верша, раскрываючы дужкі.

Да выдзеленых слоў выберыце з прапанаваных ніжэй аднакаранёвыя.

Звон, пазваніць, званок, званне.

Паход, заходзяць, хадзьба, рухаюцца.

Запішыце аднакаранёвыя словы. Выдзеліце ў іх корань. Якія змены адбыліся ў каранях слоў? Чаму?

**4.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка і правільна яе вымаўляць.

Над **бярозай** жаўталістай зоркі ззяюць прамяніста. *(М. Пазнякоў.)*

Запішыце скорагаворку па памяці.

Да выдзеленага слова падбярыце і запішыце аднакаранёвыя. Абазначце ў іх корань.

**5.** Прачытайце тэкст.

## Каршуны́

У невялікім хваёвым лясочку ўзвышалася стройная сасна. На сасне пас..лілася па́ра звычайных **каршуноў**.

Днём і ноччу **каршуніха** с..дзела ў гн..здзе на яйках. **Каршун** заўсёды кл..паціўся пра яе. Хутка на свет з'явіліся **дзеткі.**

Ішлі дні. Падр..сталі **птушаняты.**

У жніўні **каршунова** с..мейка накіравалася на поўдзень. Потым кожную в..сну птушкі вярталіся ў родныя м..сціны. *(Паводле М. Пазнякова.)*

Спішыце сказы, у якіх ёсць словы з прапушчанымі літарамі. Устаўце патрэбныя літары на месцы пропускаў.

Сярод выдзеленых слоў знайдзіце аднакаранёвыя. Абазначце ў іх корань.

**Успомніце**

Як пішуцца прыстаўкі ***аб-, ад-, пад-, над-, прад-, перад-***?




**6.** Прачытайце. Які настрой перадаецца ў вершы: сур'ёзны ці жартоўны? На якія вітаміны багатая восень?

## Дрозд

— А*(д/т)*кажы, чаму ты, дрозд,
гэтак здорава па*(д/т)*рос

— Шмат увосень еў рабіны,
ну а гэта ж — вітаміны

*В. Вітка.*

Колькі сказаў у вершы? Якія з іх пытальны, а які — апавядальны?

Спішыце, раскрываючы дужкі. Пастаўце ў канцы сказаў патрэбныя знакі прыпынку.

Выдзеліце ў словах прыстаўкі, растлумачце іх правапіс.

**7.** Да слоў падбярыце аднакаранёвыя антонімы. Запішыце пары слоў. Выдзеліце ў іх прыстаўкі.

Узор: *Замыкаць — адмыкаць, ...*

Закрываць — ..., зацвітаць — ..., пад'ехаць — ..., падключаць — ..., падступаць — ..., падбягаць — ... .

**Успомніце**

Ад чаго залежыць правапіс прыставак на ***з/с***? Выкарыстайце схемы.




**8.** Да прапанаваных слоў падбярыце аднакаранёвыя з прыстаўкамі ***бес-/бяс-, без-/бяз-***.

*Воблачны — бязвоблачны*, водны — ..., дарожны — ..., шумны — ..., платны — ..., крайні — ..., людны — ..., сардэчны — ... .

**9.** Прачытайце і адгадайце загадку.



На полі цёмным і **бя..концым**
гарох бялюткі ззяе.
А цемру як **ра..гоніць** сонца,
тады гарох знікае.
*М. Пазнякоў.*

Спішыце, устаўляючы літару ***з*** або ***с***. Абазначце прыстаўкі ў выдзеленых словах, падкрэсліце першую літару кораня.

**10.** Прачытайце. Чым прываблiваюць людзей загадкі? Адгадайце загадку, якая сустрэлася ў тэксце.



Хто не любіць загадак? Усе любяць. Добра ў вольную часіну падумаць, каб **ра*(з/с)*гадаць**, пра што ў іх гаворыцца, бо ўсе загадкі ***(з/с)*кладаюцца** з хітрых слоў. Вось паслухайце: «Сам у ботах, а хаджу на галаве». Хто ён, гэты вясёлы дзівак і штукар?

Не спяшайцеся з **а*(д/т)*казам**. Калі **а*(д/т)*гадалі** ўсё правільна — **а*(д/т)*кажыце** разам, усім класам. *(Паводле В. Віткі.)*

***штука́р*** — *выдумшчык, жартаўнік*

Выпішыце выдзеленыя словы, раскрываючы дужкі. Выдзеліце ў словах прыстаўкі. Растлумачце іх правапіс.

Загадайце аднакласнікам беларускія загадкі, якія вы ведаеце. Падрыхтуйце яшчэ некалькі загадак да наступнага ўрока.

**11.** Спішыце, устаўляючы патрэбныя літары. Выдзеліце ў словах прыстаўкі.

## Гром

Зашумеў над вёскай гром,
*(з/с)*трасянуў усё кругом.
Вось каб мне яго *(з/с)*лавіць
ды ў бубен пасадзіць.
Бубен грукаў бы, як гром,
на ўсю вёску:
— Бам! Бум! Бом!

*І. Муравейка.*

Выдзеліце канчаткі ў формах аднаго і таго ж слова.

**Успомніце**

Калі ў словах пішуцца побач дзве аднолькавыя літары?

Выкарыстайце схемы:

1) кало[с̄’]е — кало|с|с|е, збо[ж̄]а — збо|ж|ж|а,
насе[н̄’]е — насе|н|н|е, жы[ц̄’]ё — жы|ц|ц|ё;

2)  → бя|с|с|трашны, бя|з|з|убы,
а|б|б|егаць, а|д|д|аць;

3)  → ко|н|н|ы.

**12.** Утварыце словы па ўзоры.

*Корань* — *карэнны*, смятана — …, машына — …, вагон — …, сон — …, дзень — …, конь — … .

**13.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

Добры чалавек лепшы за **каме*(н/нн)*ы** мост.
Пе́шы **ко*(н/нн)*аму** не таварыш.

Якія літары трэба ўставіць у выдзеленыя словы? Разбярыце іх па саставе, растлумачце правапіс.
Запішыце па памяці адну прыказку на выбар.

**14.** Прачытайце тэкст. Як хлопчык збіраецца ў школу? Чаму важна правільна планаваць свой дзень?

## Мая раніца

Чаму я ні разу не ***(з/с)*пазніўся** ў школу? У мяне ёсць надзейны друг, які будзіць мяне. Гэта будзільнік. Я заводжу яго, стаўлю стрэлку званка на час, які мне патрэбны, каб устаць, **праветры*(т/ц)*ь** пакой, **прыбра*(т/ц)*ь** пасцель, ***(у/ў)*ключыць** чайнік.

Адзенне, абутак, партфель я **падрыхтава*(у/ў)*** яшчэ ўвечары.

Пакуль рабіў зарадку, чайнік забулькаў. Я памыўся, паснедаў.

Школа далекавата. Я ведаю, колькі часу займае дарога, але лепей **пр*(ы/і)*йсці** ў школу раней.

Я так прывык да свайго **ра*(з/с)*кладу**, што цяпер прачынаюся раней за будзільнік. Прывычка — добрая справа. *(Паводле В. Віткі.)*

Назавіце сказ, у якім заключаецца асноўная думка тэксту. Растлумачце значэнне апошняга слова ў гэтым сказе.

Выпішыце выдзеленыя словы, раскрываючы дужкі. Выдзеліце ў іх прыстаўкі.

Знайдзіце ў тэксце слова з падоўжаным зычным. Запішыце яго. Падкрэсліце адпаведныя літары.

**Рм** Раскажыце пра свой рэжым дня.

**15.** Сярод запісаных слоў знайдзіце лішняе. Вусна перакладзіце яго на рускую мову. Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

Гадзі**нн**ік, будзільнік, ча**с**, ходзікі.

Што аб'ядноўвае астатнія словы? Дапоўніце сказы гэтымі словамі і запішыце, раскрываючы дужкі.

Паўліку падарылі на дзень нараджэ*(н/нн)*я наручны  .

У в*(е/я)*сковай хаце на сц*(е/я)*не віселі  .

У сем гадзін раніцы зазвіне*(у/ў)*  .



Па чым яшчэ можна вызначаць час? Пры неабходнасці запытайцеся пра гэта ў старэйшых або знайдзіце патрэбныя звесткі ў інтэрнэце.

**16.** Спішыце. Устаўце ў словы патрэбныя літары. Абазначце ў словах корань і прыстаўку.

Бя*(с/сс)*ільны, бе*(с/сс)*парадак, бя*(с/сс)*нежны, бе*(з/зз)*бярэжны, бя*(з/зз)*убы, бя*(с/сс)*ледны, бе*(с/сс)*памылковы, а*(б/бб)*егчы, а*(д/дд)*аліцца.

**17.** Прачытайце загадкі. З «рассыпаных» літар складзіце словы-адгадкі.

1. Каб знайсці які наедак,
**а(*бб/б*)яжыць** лес, луг, палетак,
**а(*б/п*)шукае** ўсе разлогі.
Кажуць: яго кормяць ногі.

*І. Муравейка.*

*в к ў о*

2. Што за ко(*н/нн*)ік у сядле?
Ногі — за вушамі.
Вельмі зоркі ён. Але
**а(*д/т*)гадайце** самі.

*М. Пазнякоў.*

*ы л я у а к р*

***пале́так** — поле*
***разло́г** — раздолле; шырокая, вольная прастора*

Спішыце, раскрываючы дужкі. Абазначце ў выдзеленых словах корань і прыстаўку.

**18.** З асобных слоў складзіце і запішыце сказ. Падкрэсліце ў ім дзейнік і выказнік.

За, шуміць, вецер, акно, асенні.

Вызначце, якой часцінай мовы з'яўляецца кожнае слова ў сказе.

**Успомніце**

Якія часціны мовы вы ведаеце? Як яны змяняюцца? Якая часціна мовы мае род, а якія — могуць змяняцца па родах? Якая іх роля ў сказе? Прывядзіце прыклады. Выкарыстайце табліцу.

| | Часціны мовы | | | |
|---|---|---|---|---|
| | **назоўнік** | **прыметнік** | **дзеяслоў** | **пры-назоўнік** |
| ***мн. л./ адз. л.*** | змяня-ецца | змяня-ецца | змяня-ецца | — |
| ***м. р./ ж. р./ н. р.*** | ма́е | змяня-ецца ў адз. л. | змяняецца ў пр. ч. адз. л. | — |
| ***пр. ч./ цяп. ч./ буд. ч.*** | — | — | перадае час дзеяння | — |
| **у сказе** | дзейнік, дад. чл. сказа | дад. чл. сказа | выказнік | служыць для су-вязі слоў |

**19.** Прачытайце. Пра якую прыродную з'яву ідзе размова ў вершы? Якое яшчэ значэнне мае слова *лістапад*?



## Лістапад

Над зямлёй — неба добры паглЯ́д.
Каляровае лісце кружляе.
Лістапад, малады лістапад
ласкай лісця зямлю атуляе.

*В. Жуковіч.*



***кружля́е*** — тут: *кру́жыць*
***атуля́е*** — рус. *оку́тывает*

Спішыце. Пазначце над словамі, якой часцінай мовы яны з'яўляюцца. Вызначце род і лік прыметнікаў.

**20.** Прачытайце. Вызначце межы сказаў. Запішыце тэкст, раскрываючы дужкі. Правільна аформіце сказы на пісьме.

## Шпачыныя песні

*(З)*бяроз злятае апошняя лістота агаліліся *(у)*садзе дрэвы сталі відаць шпакоўні ў ясным асе*(н/нн)*ім небе чуецца сумны посвіст нехта спявае прыгожую ра*(с/з)*вітальную песню я ў*(с/з)*німаю галаву на галінках дрэў ра*(с/сс)*еліся шпакі. *(Паводле М. Даніленкі.)*

***по́свіст** — свіст, спеў*

Знайдзіце ў тэксце аднакаранёвыя словы да назоўніка *шпачаня́*. Выдзеліце ў іх корань. Пазначце, якой часцінай мовы яны з'яўляюцца.

Знайдзіце і прачытайце сказ, які адпавядае схеме.




**21.** Знайдзіце ў кожным радзе слоў лішняе. Што аб'ядноўвае астатнія словы ў кожным радзе?

Чырвоная, каляровае, густы, ляцяць, спелыя.
Рабіна, лісце, туман, яблыкі, восеньскі.
Ападае, птушкі, сцелецца, расце, ляжаць.
Каля, на, над, пад, лес, у.
Дом, зямля, па, луг, кошыкі.

Прыдумайце і запішыце сказ. Выкарыстайце ў ім па адным слове з кожнага рада. Вызначце род назоўнікаў.

# ЗМЕСТ


ПАЎТАРЭННЕ ... 3

ТЭКСТ ... 16

Сувязь сказаў у тэксце ... 16

Тыпы тэкстаў ... 20

Тэкст-апавяданне ... 24

Тэкст-апісанне ... 27

Тэкст-разважанне ... 32

СКАЗ ... 42

Аднародныя члены сказа ... 44

Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі ... 54

СКЛАД СЛОВА ... 69

Аснова слова ... 69

НАЗОЎНІК ... 77

Змяненне назоўнікаў па склонах ... 77

Тры скланенні назоўнікаў ... 84

Назоўнікі 1-га скланення, іх канчаткі ... 87

Назоўны, родны і вінавальны склоны ... 91

Давальны і месны склоны ... 94

Творны склон ... 97

Назоўнікі 2-га скланення, іх канчаткі ... 100

Родны склон ... 107

Давальны склон ... 112

Творны склон ... 114

Месны склон ... 117

Назоўнікі 3-га скланення, іх канчаткі ... 120

Назоўны і вінавальны склоны ... 123

Родны, давальны і месны склоны ... 125

Творны склон ... 128

Скланенне назоўнікаў у множным ліку ... 130

Родны склон ... 134

Давальны і творны склоны ... 137

Месны склон ... 139